Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
_____________Ю.П.Бондар
“___” _____________2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Рабочая праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія*
*(па напрамках) напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02*
*Культуралогія (прыкладная) спецыялізацыі 1-21 04 01-02 01*
*Менеджмент сацыяльнай і культурнай сферы*

Мінск 2012

**Складальнік:**

*С.А.Пацыенка,* дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат культуралогіі.

**Рэцэнзенты:**

*М.М.Каралёў*, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дэкан факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

*Ю.Г.Болатава*, кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі ПУА «Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава»

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № ад г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № ад г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю
Адказны за выпуск *С.А.Пацыенка*

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

“Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне сацыякультурнай дзейнасці” – вучэбны курс для студэнтаў 3 курса спецыялізацыі “менеджмент сацыяльна-культурнай сферы” факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Агульны аб’ём курса складае: 16 гадзін лекцыйных заняткаў, 12 – семінарскіх, 10 – лабараторных.

Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне з’яўляецца адным з найважнейшых кампанентаў дзейнасці ўстаноў культуры і народнай творчасці. У Рэспубліцы Беларусь сістэма інфармацыйна-метадычнага забеспячэння прадстаўлена наступнай структурай: Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, абласныя метадычныя цэнтры народнай творчасці і культасветработы, раённыя арганізацыйна-метадычныя цэнтры ці раённыя дамы і цэнтры культуры.

У адпаведнасці з Праграмай па адраджэнні і развіцці сяла, якая ажыццяўляецца беларускім Урадам, неабходнай задачай з’яўляецца забеспячэнне раённых метадычных структур высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Падрыхтоўка такіх спецыялістаў будзе спрыяць удасканальванню якаснага ўзроўню інфармацыйна-аналітычнай і арганізацыйна-метадычнай дзейнасці метадычных служб абласцей і раёнаў краіны.

На працягу апошніх гадоў адбываўся працэс удасканалення зместу, структуры і форм дзейнасці метадычных цэнтраў усіх узроўняў, былі вызначаны прыярытэтныя кірункі дзейнасці, назапашаны пэўны вопыт работы. Асноўным зместам курса з’яўляецца знаёмства з напрамкамі дзейнасці метадычных цэнтраў розных узроўняў, сучаснымі методыкамі арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці, тэхналогіямі засваення і распаўсюджання перадавой практыкі сацыяльна-культурнай дзейнасці і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мэтай курса** з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў ведаў і навыкаў у сферы інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці.

**Задачы курса:**

- азнаёміцца з сутнасцю і зместам інфармацыйна-метадычнага забеспячэння ў сацыяльна-культурнай сферы;
- разгледзець сістэму інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь;
- авалодаць інструментарыем інфармацыйна-метадычнай дзейнасці

У адпаведнасці з мэтай і задачамі курса студэнт павінен: **ведаць** змест і структуру інфармацыйна-метадычнага забеспячэння; **умець** мадэліраваць, апрабіраваць і ўкараняць методыкі, якія адпавядаюць запатрабаванням сучаснага грамадства, аказваць практычную дапамогу ўстановам культуры розных тыпаў у працэсе засваення метадаў работы з разнастайнымі катэгорыямі насельніцтва; **валодаць навыкамі** аналізу і ўкаранення перадавога вопыта, стварэння метадычных матэрыялаў.

Праграма курса складаецца з лекцыйных, семінарскіх, лабараторных заняткаў. Завяршаецца курс залікам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ДЛЯ СТУДЭНТАЎ СТАЦЫЯНАРА

| № п/п | Назва тэмы | Лекцыі | Сем. заняткі | Лаб. заняткі |
|---|---|---|---|---|
| | *Сутнасць інфармацыйна-метадычнага забеспячэння ў сацыяльна-культурнай сферы* | | | |
| 1.1 | Тэарэтычныя асновы інфармацыйна-метадычнага забеспячэння СКД | 2 | | |
| 1.2 | Асноўныя напрамкі і функцыі інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці | 2 | 2 | |
| 1.3 | Метадалогія і методыка СКД: прадмет, мэты і задачы курса | | 2 | |
| 1.4 | Формы, метады і сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці | 2 | 2 | |
| | *Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь* | | | |
| 2.1 | Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў культуры ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | | 2 |
| 2.2 | Інстытут Беларускай культуры – галоўны навукова-метадычны цэнтр у Рэспубліцы Беларусь | | | |
| 2.3 | Дзейнасць абласных і раённых метадычных цэнтраў | 2 | 2 | 2 |
| 2.4 | Сістэма павышэння кваліфікацыі і дадатковая адукацыя работнікаў сацыякультурнай сферы | 2 | 2 | |
| | *Інструментарый інфармацыйна-метадычнай дзейнасці* | | | |
| 3.1 | Метадычныя веды і метадычныя матэрыялы як прадукт метадычнай дзейнасці | | | 2 |
| 3.2 | Віды метадычных матэрыялаў, іх структура і змест | 2 | | |
| 3.3 | Тэхналогіі распрацоўкі метадычных матэрыялаў | | | 2 |
| 3.3 | Тэхналогія засваення і распаўсюджання перадавога вопыту | 2 | 2 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | сацыяльна-культурнай дзейнасці | | | |
| | Усяго: 38 | 16 | 12 | 10 |

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ЗАВОЧНАГА АДДЗЯЛЕННЯ

| № п/п | Назва тэмы | Лекцыі | Сем. заняткі | Лаб. заняткі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Тэарэтычныя асновы інфармацыйна-метадычнага забеспячэння | 2 | | 2 |
| 2 | Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў культуры ў Рэспубліцы Беларусь | | 2 | 2 |
| 3 | Тэхналогія засваення і распаўсюджання перадавой практыкі сацыяльна-культурнай дзейнасці | 2 | 2 | 2 |
| | Усяго: 12 | 4 | 4 | 6 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Лекцыйныя заняткі

### Тэма 1. Тэарэтычныя асновы інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці

Аб’ект і суб’ект інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці. Метад як асноўны спосаб пазнання сацыяльна-культурнай дзейнасці. Агульная характарыстыка метадаў збору пярвічнай інфармацыі: назіранне, апытанне, эксперымент, аналіз дакументаў, тэсціраванне і г.д. Метад як сукупнасць прыёмаў практычнага засваення рэчаіснасці. Метад сацыякультурнай дзейнасці як механізм рэалізацыі тэорыі ў практычную дзейнасць устаноў культуры. Метадычная дзейнасць: мэты, задачы, змест, сродкі, метады і формы.

### Тэма 2. Асноўныя напрамкі і функцыі інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці

Мэты і задачы інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці. Асноўныя кірункі метадычнага забеспячэння як матыў рэалізацыі функцый.

Пазнавальная функцыя, рэалізаваная праз напрамкі метадычнага забеспячэння: аналіз інфармацыі, вывучэнне патрэбнасцей у методыцы, ацэнка вопыту работы. Канструктыўная: распрацоўка рэкамендацый,

мадэліраванне методык, інфармацыйна-метадычная дзейнасць, арганізацыйна-педагагічнае суправаджэнне працэсаў укаранення інавацыйных методык.

### Тэма 3. Формы, метады і сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці

Паняцце аб формах сацыяльна-культурнай дзейнасці і іх тыпалогія. Класіфікацыя форм: па суб’екту арганізацыі выхаваўчай работы ў сферы вольнага часу; па колькасных паказчыках аўдыторыі; па сацыяльна-дэмаграфічных характарыстыках; па асноўных кірунках сацыяльна-культурнай дзейнасці; па арганізацыйных асаблівасцях і інш.

Паняцце аб метадах сацыяльна-культурнай дзейнасці і іх характарыстыка. Метады ўключэння ў сацыяльна-культурную дзейнасць. Метады фарміравання грамадскай свядомасці. Метад стымулявання сацыяльна-культурнай актыўнасці. Метады сацыялагічных даследванняў у сацыяльна-культурнай сферы.

Вядучыя сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Выхаваўчы патэнцыял жывога слова, мастацтва, нагляднасці і іншых сродкаў. Роля і месца друку, радыёвяшчання і тэлебачання, кампутарных тэхналогій у сацыяльна-культурнай дзейнасці. Узаемасувязь і ўзаемадапаўненне сродкаў, форм і метадаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

### Тэма 4. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў культуры ў Рэспубліцы Беларусь

Структура сістэмы навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў культуры ў краіне: Інстытут беларускай культуры, абласныя метадычныя цэнтры народнай творчасці і культасветработы, раённыя арганізацыйна-метадычныя цэнтры ці раённыя дамы і цэнтры культуры.

Сучасная інфраструктура сацыякультурнай сферы ў рэгіёнах: сельскія дамы культуры, цэнтры вольнага часу, цэнтры фальклору, дамы рамёстваў, дамы сацыяльна-культурных паслуг, школы традыцыйнай культуры, школы народнай творчасці, цэнтры нацыянальных культур і г.д.

Метадычныя цэнтры як каардынатары культурнага развіцця рэгіёнаў: дзейнасць метадычных цэнтраў па распрацоўцы і рэалізацыі рэгіянальных культурных праграм, па аднаўленню і захаванню традыцыйнай культуры, метадычным забеспячэнні развіцця аматарскай мастацкай і тэхнічнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 5. Дзейнасць абласных і раённых метадычных цэнтраў

Цэнтры народнай творчасці і культасветработы як асноўныя структуры ў сістэме навукова-метадычнага забеспячэння. Дзейнасць Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра; Віцебскага і Магілёўскага абласных навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культасветработы; Гомельскага, Гродзенскага і Мінскага абласных цэнтраў народнай творчасці.

Раённый метадычны цэнтр народнай творчасці як каардынатар сацыяльна-культурнага жыцця рэгіёну. Функцыі РНМЦ: арганізацыйна-метадычная, пошукава-аналітычная, вопытна-эксперыментальная, выдавецкая. Асноўныя кірункі дзейнасці РНМЦ.

### Тэма 6. Сістэма павышэння кваліфікацыі і дадатковая адукацыя работнікаў сацыякультурнай сферы

Інфармацыйнае забеспячэнне навукова-метадычнай дзейнасці ў сферы культуры. Агульныя патрабаванні да сістэмы падвышэння кваліфікацыі: бесперапыннасць, якая забяспечвае сталы рост прафесійнага майстэрства, markerразнабаковасць, дыферэнцыраванасць. Завочнае навучанне працаўнікоў культуры. Навукова-практычныя канферэнцыі. Асаблівасці навучальнага працэсу ў сістэме падвышэння кваліфікацыі. Асноўныя прынцыпы галіновай сістэмы інфармацыі - цэнтралізацыі выданняў інфармацыйных матэрыялаў, прамая сувязь, выкарыстанне фондаў, стварэнне адзінага галіновага даведкава-інфармацыйнага фонду, сістэматызацыя.

### Тэма 7. Віды метадычных матэрыялаў, іх структура і змест

Метадычныя матэрыялы як адзін з каналаў перадачы і распаўсюджання перадавой практыкі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Метадычныя рэкамендацыі, інфармацыйныя матэрыялы, метадычныя дапаможнікі, інструктыўныя лісты, наглядныя матэрыялы і інш. Структура і змест метадычных матэрыялаў. Патрабаванні да метадычных матэрыялаў.

### Тэма 8. Тэхналогія засваення і распаўсюджання перадавога вопыту сацыяльна-культурнай дзейнасці

Сутнасць паняцця “вопыт сацыяльна-культурнай дзейнасці”. Асноўныя этапы вывучэння перадавога вопыту. Метады вывучэння і распаўсюджання перадавога вопыту. Формы абагульнення перадавога вопыту. Патрабаванні да кваліфіцыраванага апісання перадавога вопыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

С е м і н а р с к і я   з а н я т к і

## Тэма 1. Асноўныя напрамкі і функцыі інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці

1. Мэты і задачы інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці.
2. Сутнасць метадычнага забеспячэння і яго адрозненне ад “метадычнага кіраўніцтва”.
3. Навуковыя асновы метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці.
4. Асноўныя функцыі метадычнай дзейнасці.

## Тэма 2. Метадалогія і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці: прадмет, мэты і задачы курса

1. Сацыяльна-культурная дзейнасць як самастойны фундаментальны навуковы і адукацыйны кірунак у беларускай інфармацыйнай прасторы.
2. Вывучэнне і асэнсаванне гістарычнага вопыту, тэарэтычных асноў і тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці як самастойнай галіны навуковых ведаў.
3. Прадмет метадычнага забеспячэння, яго характарыстыка.
4. Творчы падыход і інавацыйныя ідэі як характэрныя рысы сучаснага метадычнага забеспячэння.

## Тэма 3. Формы, метады і сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці

1. Асноўныя формы сацыяльна-культурнай дзейнасці.
2. Асноўныя групы метадаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.
3. Сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці.
4. Узаемадапаўненне сродкаў, форм і метадаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

## Тэма 4. Дзейнасць абласных і раённых метадычных цэнтраў

1. Асноўныя кірункі дзейнасці абласных навукова-метадычных цэнтраў: рэгіянальны аспект.
2. Раённы метадычны цэнтр як каардынатар культурнага жыцця рэгіёну.
3. Сучасны стан інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сельскіх клубных устаноў.
4. Дзейнасць Інстытута Беларускай культуры як галоўнага навукова-метадычнага цэнтра ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 5. Сістэма павышэння кваліфікацыі і дадатковая адукацыя работнікаў сацыякультурнай сферы

1. Сістэма павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры і мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь.
2. Структура ўстаноў павышэння кваліфікацыі і дадатковай адукацыі.
3. Месца і роля навукова-метадычных цэнтраў у сістэме павышэння кваліфікацыі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы і народнай творчасці.
4. Формы павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры ў метадычных цэнтрах розных узроўняў.

### Тэма 6. Тэхналогія засваення і распаўсюджання перадавога вопыту сацыяльна-культурнай дзейнасці

1. Асноўныя крытэрыі ацэнкі перадавога вопыту (навізна, высокая рэзультатыўнасць, прагназуемасць вынікаў, перспектыўнасць).
2. Этапы работы з перадавым вопытам: збор, назапашванне, аналіз, апрацоўка інфармацыі.
3. Прыёмы практычнага выкарыстання перадавога вопыту.
4 Крыніцы перадавога вопыту сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Л а б а р а т о р н ы я   з а н я т к і

### Тэма 1. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў культуры ў Рэспубліцы Беларусь

Наведванне метадычнага кабінета адной з ўстаноў культуры г.Мінска (Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў, Дома культуры ветэранаў, Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі і г.д.). Азнаямленне з кірункамі дзейнасці, структурай, функцыямі метадычнага кабінета. Сумеснае з супрацоўнікамі абмеркаванне праблем сучаснага стану інфармацыйна-метадычнага забеспячэння галіны, выяўленне яго спецыфікі.

### Тэма 2. Дзейнасць абласных і раённых метадычных цэнтраў

Сустрэча з супрацоўнікамі метадычных цэнтраў абласнога і раённага ўзроўняў. Азнаямленне з тыпамі, функцыямі, кірункамі дзейнасці, пытаннямі кадравага забеспячэння метадычных цэнтраў Рэспублікі Беларусь.

Правядзенне вучэбнай гульні “Наш метадычны цэнтр”. Студэнтам прапануецца змадэліраваць працу метадычнага цэнтра: вызначыць асноўныя задачы і функцыі метадычнага цэнтра, распрацаваць яго структуру, вылучыць і абгрунтаваць прыярытэтныя кірункі дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты атрымліваюць заданне азнаёміцца з Палажэннем аб абласным метадычным цэнтры, Палажэннем аб раённым метадычным цэнтры.

**Тэма 3. Метадычныя веды і метадычныя матэрыялы як прадукт метадычнай дзейнасці**

Аналіз прадуктаў метадычнай дзейнасці. Азнаямленне студэнтаў з асноўнымі відамі метадычных матэрыялаў (метадычны дапаможнік, метадычная рэкамендацыя, сцэнарый, аудыёвідэаматэрыялы, апісанне передавога вопыту і г.д.). Дэманстрацыя метадычных матэрыялаў па інавацыйных відах дзейнасці: новых тыпах установ культуры (цэнтры і дамы фальклору, дамы рамёстваў, клубы-майстэрні); новых формах павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў культуры, кіраўнікоў мастацкіх аматарскіх калектываў. Прагляд відэаматэрыяла, прысвечанага дзейнасці цэнтра рамёстваў.

**Тэма 4. Тэхналогіі распрацоўкі метадычных матэрыялаў**

Азнаямленне студэнтаў з патрабаваннямі да метадычных матэрыялаў. Правядзенне кожным студэнтам індывідуальнага аналізу канкрэтнага метадычнага матэрыяла на прадмет адпаведнасці прад'яўляемым патрабаванням.

Азнаямленне студэнтаў з этапамі распрацоўкі метадычных матэрыялаў: выбар віда метадычнай распрацоўкі (па жаданні студэнта); сістэматызацыя, кампаноўка, афармленне матэрыяла.

Кожнаму студэнту прапаноўваецца стварыць метадычную рэкамендацыю для адной з установ культуры і прадставіць прэзентацыю гэтай рэкамендацыі. Кожнае выступленне заканчваецца калектыўным абмеркаваннем.

**Тэма 5. Тэхналогія засваення і распаўсюджання перадавога вопыту сацыяльна-культурнай дзейнасці**

Азнаямленне студэнтаў з асноўнымі крытэрыямі ацэнкі перадавога вопыту (навізна, высокая рэзультатыўнасць, прагназуемасць вынікаў, перспектыўнасць). Этапы работы з перадавым вопытам: збор, назапашванне, аналіз, апрацоўка інфармацыі. Аналіз метадычных матэрыялаў аб перадавым вопыце. Прагляд відэасправаздач аб перадавым вопыце.

Распрацоўка студэнтамі метадычных матэрыялаў аб перадавым вопыце з выкарыстаннем канкрэтнага практычнага матэрыяла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА (АСНОЎНАЯ)


1. Аванесова, Г.А. Культурно-досуговая деятельность: Теория и практика организации: Учеб. пособие для студентов вузов/ Г.А.Аванесова. – М.: Аспект Пресс, 2006. – 236 с.
2. Аксюцік, М.І. Сацыяльна-культурная дзейнасць: вучэб.-метад. дапам. / М. Аксюцік . – Мн.: ІСВ, 2003. – 102 с.
3. Алейнікаў, С.М., Голубева, І.Р., Іўчанка, В.М. Сацыяльны партрэт будучага спецыяліста ўстаноў культуры: Па выніках сацыялагічнага даследавання “Вывучэнне запатрабаванняў галіны культуры ў кадрах устаноў культуры клубнага тыпу” / С.М. Алейнікаў, І.Р. Голубева, В.М. Іўчанка // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфарм. зб. / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2001. – Вып.4. – С. 24 – 66.
4. Бухель, С.Л. Информационно-методическое обеспечение деятельности сельских клубных учреждений / С.Л.Бухель. – Мн.: Вестник БелГИПК, 2001. – С. 56 – 60.
5. Варфаламеева, Г.Б., Боганева, А.М. Ахова, захаванне, пераемнасць і папулярызацыя беларускага аўтэнтычнага фальклору / Г.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева // Весн. Бел. дзярж. ін-та праблем культуры: навук.-метад. зб. – Мн., 2001. – С. 55–64.
6. Грыгаровіч, Я.Д., Смолік, А.І. Прыкладная культуралогія: вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці “Культуралогія” устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / Я.Д. Грыгаровіч, А.І.Смолік. – Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 216 с.
7. Грыгаровіч, Я.Д., Смолік, А.І., Рагачова Л.М. Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы / Я.Д. Грыгаровіч, А.І.Смолік, Л.М.Рагачова. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2001. – 158 с.
8. Жарков, А.Д. Технология культурно-досуговой деятельности: Учебное пособие для студентов вузов культуры и искусств. – 2-е изд. перераб. и доп. – М.: Изд-во МГУК, ИПО «Профиздат», 2002. – 288 с.
9. Жмачынская, Л.Ф., Макарава, А.А. Аб некаторых выніках рэспубліканскага агляду-кункурсу абласных навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культасветработы (2001 г.) // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфарм. зб. / Нац. б-ка РБ. – Мн., 2002. – Вып.6. – С. 41 – 52.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Киселева, Т.Г., Красильников, Ю.Д. Социально-культурная деятельность: Учебник / Т.Г.Киселёва, Ю.Д.Красильников. – М.: МГУКИ, 2004. – 539 с.
11. Культурно-досуговая деятельность: Учеб. для вузов культуры и искусств / Т.Г.Васильева, Ю.Г. Волков, В.А. Волобуев и др.; Под науч. ред. А.Д. Жаркова, В.М. Чижикова. – М.: МГУК, 1998. – 461 с.
12. Мосалёв, Б.Г. Методическое руководство деятельностью клубного учреждения: Учебное пособие / Б.Г.Мосалёв. – М.: МГИК, 1989. – 76 с.
13. Современная Беларусь: энциклопедический справочник. В 3 т. – Т. 3. Культура и искусство / редкол.: М.В.Мясникович [и др.]. – Мн.: Белорус. наука, 2007. – 778 с.
14. Стружэцкі, Т.І. Аб навукова-метадычным забеспячэнні дзейнасці ўстаноў культуры і народнай творчасці / Т.І.Стружэцкі // Апэратыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфарм. зб. / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2001. – Вып.4. – С. 6 – 17.
15. Чижиков, В.М. Методическое обеспечение культурно-досуговой деятельности / В.М.Чижиков // Культурно-досуговая деятельность: Учебник. – М.: МГУК, 1998. – С. 381 – 429.
16. Чижиков, В.М. Методическое обеспечение культурно-досуговой деятельности: Учеб. пособ. / В.М.Чижиков. – М.: МГИК, 1991. – 142 с.
17. www. kimpress.by

## РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА (ДАДАТКОВАЯ)

1. Бакланова, Н.К. Профессиональное мастерство работника культуры: Учеб. пособие для студентов худож. специализаций вузов культуры и искусств и пединститутов / Н.К. Бакланова. – М: Изд-во Моск. гос. ун-та культуры, 1996. – 120 с.
2. Педагогика досуга: Учебник / А.Ф. Воловик, В.А. Воловик. – М.: Флинта: Московский психолого-социальный институт, 1998. – 240 с.
3. Мосалев, Б.Г. Досуг: методология и методика социологических исследований: Учеб. Пособие / Б.Г.Мосалёв. – М.: Изд-во Моск. гос. ун-та культуры, 1995. – 94 с.
4. Народная художественная культура: Учеб. для вузов культуры искусств / Т.И.Бакланова, Г.П.Блинова, О.А.Блох и др.; Под общ. ред. Т.И. Баклановой, Е.Ю. Стрельцовой; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – М.: МГУКИ, 2000. – 412 с.
5. Рэгіянальныя мэтавыя праграмы: некаторыя пытанні тэорыі і практыкі / М-ва культуры РБ; БелДІПК; Нац. б-ка Беларусі; Склад. А.М.Боганёва, Л.М.Міхальчук. – Мн., 2001. – 102 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ